**УДК 904:739.1(476.5-21) DOI 10.52928/2070-1608-2023-67-2-6-12**

# ПАПЯРЭДНІЯ ВЫНІКІ ДАСЛЕДАВАННЯ МОГІЛЬНІКА XI-XIII стст. НА ТЭРЫТОРЫІ ВЕРХНЯГА ЗАМКА ПОЛАЦКА[1]

*канд. гіст. навук, дац. І.У. МАГАЛІНСКІ*
*канд. біял. навук, дац. В.А. ЕМЕЛЬЯНЧЫК, А.Л. КОЦ*
*(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай)*

*П.М. КЕНЬКО*
*(Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск)*

*У артыкуле прадстаўлены папярэднія вынікі даследавання некропаля XI–XIII стст., які быў выяўлены падчас выратавальных археалагічных прац на тэрыторыі Верхняга замка Полацка. У выніку вывучэння астэалагічнага матэрыялу вызначаны шкілетныя рэшткі не менш 160 індывідаў сярод якіх 87 належалі дарослым, а 73 – дзецям рознага ўзросту. Аўтарамі ўстаноўлена, што пахаванні зроблены ў драўляных трунах і маюць пераважна заходнюю арыентацыю з адхіленнямі на поўнач і поўдзень. Датаванне могільніка праведзена на аснаванні пахавальнага інвентару, сярод якога сустрэты аднабаковыя грабяні, шкляныя бранзалеты, шыферныя прасліцы і іншыя датуючыя артэфакты. Асноўваючыся на асобных знаходках, аўтары мяркуюць аб магчымай прыналежнасці могілак да невядомага сёння цаглянага будынка культавага прызначэння.*

***Ключавыя словы:*** *археалогія Беларусі, пахавальныя помнікі, матэрыяльная культура, тапаграфія Полацка.*

**Уводзіны.** Важнейшае значэнне для рэканструкцыі розных бакоў сацыяльнай і этнічнай гісторыі старажытных гарадскіх паселішчаў маюць сінхронныя ім могільнікі. Асаблівы статус некропаляў у соцыятапаграфічнай структуры горада абумовіў цікавасць сярод даследчыкаў да пытання лакалізацыі месцаў пахаванняў жыхароў Полацка, які з’яўляўся адным з буйнейшых гарадскіх цэнтраў Усходняй Еўропы сярэдневяковага перыяду. Доўгі час даследаванні пахаванняў старажытных палачан не мелі сістэматычнага характару і толькі ў апошнія гады атрымалася лакалізаваць гарадскія могілкі XIV–XVIII стст. [1–5].

Між тым, важнейшае значэнне для вывучэння ранняй гісторыі Полацка мае лакалізацыя гарадскога хрысціянскага некропаля XI–XIII стст., які не быў устаноўлены археалагічна і раней вызначаўся толькі на аснаванні картаграфічных звестак, а таксама асобных выпадковых знаходак. М.А. Плавінскі і Д.У. Дук у спецыяльнай працы, прысвечанай выяўленню месца размяшчэння гарадскіх могілак X–XIII стст. сцвярджалі, што на тэрыторыі Полацка існавала не менш двух курганных некропаляў (“паўночны” і “ўсходні”), а таксама грунтавы могільнік XII ст. на першапачатковым Гарадзішчы. Пры гэтым аўтары адзначаюць, што існаванне “паўночнага” могільніка з’яўляецца выключна гіпатэтычным меркаваннем, у той час як лакалізацыя “ўсходняга” некропаля мае таксама і археалагічныя пацвярджэнні [6, с. 182]. Тэзіс пра існаванне могільніка XII ст. на тэрыторыі Гарадзішча заснаваны на выпадкова выяўленым пахаванні [6, с. 183]. Наступныя даследаванні помніка меркаванне адносна існавання тут могільніка ў XI–XIII стст. не пацвердзілі [5].

Такім чынам, важнай праблемай полацкай археалогіі да цяперашняга часу з’яўлялася лакалізацыя гарадскога некропаля XI–XIII стст., месцазнаходжанне якога атрымалася выявіць падчас археалагічных работ у 2020–2022 гг. на тэрыторыі Верхняга замка старажытнага горада.

**Асноўная частка.** Полацкі некропаль быў выяўлены ў ходзе правядзення комплексу выратавальных археалагічных раскопак падчас будаўнічых работ на аб’екце “Рэканструкцыя былых будынкаў установы аховы здароўя ў ахоўнай зоне запаведніка (Верхні замак) пад размяшчэнне ДУА “Полацкае кадэцкае вучылішча”, якія ажыццяўляліся ў перыяд з лістапада 2019 па снежань 2022 г. (малюнак 1) [7].

Археалагічныя даследаванні каардынаваліся доктарам гістарычных навук, прафесарам, галоўным навуковым супрацоўнікамі ДНУ “Інстытут гісторыі” НАН Беларусі В.М. Ляўко. Працы на месцы праводзіліся пад агульным кіраўніцтвам супрацоўніка Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай І.У. Магалінскага. У работах прымалі ўдзел супрацоўнікі ўніверсітэта (А.Л. Коц, В.А. Емельянчык, В.У. Чараўко), Інстытута гісторыі НАН Беларусі (П.М. Кенько, У.С. Крумплеўскі і інш.), а таксама Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка (Л.Р. Калбека, А.А. Салаўёў). Земляныя працы на аб’екце прадугледжвалі перакладку камунікацый, а таксама ўмацаванне падмуркаў наяўных будынкаў і будаўніцтва новых карпусоў.

Першапачатковае выяўленне шкілетных рэштказ было зроблена на пляцоўцы будаўніцтва спарткомплексу, якая размяшчалася ў паўночна-заходняй частцы аб’екта. Праектам прадугледжвалася ўладкаванне буранабіўных падмуркаў, а таксама распрацоўка катлавана ў паўднёвай частцы. На месцы будаўнічай пляцоўкі да пачатку прац размяшчаўся комплекс гаспадарчых пабудоў былой гарадской бальніцы. У рамках работ на асобных участках

[1] Артыкул падрыхтаваны ў межах праекта Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў “Пахавальныя помнікі Полацка XI–XVIII стст. у кантэксце развіцця сінхронных некропаляў Беларускага Падзвіння: пахавальны абрад, інвентар, палеаантрапалагічная характарыстыка” (нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 20221071 ад 06.07.2022).

прадугледжвалася выбарка падмуркаў гэтых канструкцый з дапамогай будаўнічай тэхнікі. Для разбору падмуркаў распрацоўваліся шурфы, у якіх зафіксаваны пераадкладзены культурны пласт магутнасцю да 1,5 м. Падчас работ у паўночнай частцы пляцоўкі выяўлены фрагменты керамікі і пячной кафлі XVII–XVIII стст. [7, с. 51]. У заходняй частцы ўчастка падчас разборкі падмуркаў выяўлены фрагмент пашкоджанага безінвентарнага пахавання. Шкілет быў арыентаваны галавой на захад, а само пахаванне мела працяг ва ўсходняй сцяне. Пахаванне размяшчалася на ўзроўні мацерыка і знаходзілася ў труне ад якой захавалася спарахнелая драўніна [7, с. 53].




**1 – Сафійскі сабор; 2 – р. Палата; 3 – будынак харчблока; 4 – фундаменты "храма на дзяцінцы"; 5 – размяшчэнне могільніка на аснове атрыманых даных**

**Малюнак 1. – Лакалізацыя могільніка XI–XIII стст. на тэрыторыі Верхняга замка Полацка**

Наступны этап даследавання могільніка звязаны з распрацоўкай у паўднёвай частцы пляцоўкі спарткомплекса катлавана для будаўніцтва падвальнага памяшкання. Як адзначалася, культурны слой на месцы даследавання быў істотна пашкоджаны гаспадарчымі будынкамі былой гарадской бальніцы, у сувязі з чым працы праводзіліся з дапамогай будаўнічай тэхнікі з паслойным зняццем пераадкладзенага культурнага пласта. Падчас прац у перадмацерыковым слоі былі зафіксаваныя плямы магільных ям з рэшткамі трун і касцякамі ў іх, якія разбіраліся ўручную з фота- і графічнай фіксацыяй. Наступныя групы пахаванняў былі выяўлены падчас распрацоўкі траншэй каналізацыі і водаправода, якія праходзілі паралельна ўсходняй мяжы будаўнічай пляцоўкі спарткомплекса.

Могільнік часткова даследаваны раскопам (Заходні раскоп 1, 2021 г.), які размяшчаўся па трасе траншэі пад водаправод і ліўневую каналізацыю на ўчастку паміж харчаблокам і спарткомплексам. Раскоп быў выцягнуты з поўначы на поўдзень і меў памер 14,0 × 5,0 м. Верхнія пласты ў раскопе былі знішчаны ў выніку актыўнай гаспадарчай дзейнасці, у сувязі з чым культурны слой утрымліваў матэрыялы пераважна X–XIII стст. У межах трэцяга ўмоўнага пласта, які прадстаўлены чорнай вільготнай дробнакамкаватай глебай, былі выяўлены рэшткі драўлянай агароджы, якая размяшчалася па трасе ад паўночна-заходняга да паўднёва-ўсходняга вугла раскопа. Дадзены частакол з'яўляўся мяжой паміж багатай сядзібай і могілкамі (на захад і поўдзень ад агароджы выяўлены пахаванні).

Для ўдакладнення паўночнай мяжы некропаля ў 2022 г. былі праведзены разведачныя раскопкі ў прыватным сектары, на захад ад будынка правіянцкага складу (Заходні раскоп 2). У выніку выяўлены культурны пласт з матэрыяламі XI–XVIII стст. без слядоў пахаванняў.

Такім чынам, у ходзе археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Верхняга замка Полацка ўпершыню быў атрыманы вялікі астэалагічны матэрыял па сярэдневяковаму насельніцтву Полацка XI–XIII стст. Усяго падчас археалагічных прац было выяўлена не менш 115 дакладна зафіксаваных пахаванняў, частка з якіх была прадстаўлена амаль поўнымі касцякамі, частка – няпоўнымі і парушанымі, сустрэты таксама пераадкладзеныя скопішчы костак, асобныя фрагменты шкілетаў розных індывідаў. Пахаванні зроблены ў драўляных трунах, якія былі выкананы з дошак, часта абкладзеныя бяростай (малюнак 2). Арыентацыя пахаваных заходняя, з адхіленнямі на поўнач і поўдзень.




**Малюнак 2. – Сітуацыйны план размяшчэння даследаваных пахаванняў могільніка XI–XIII стст. на тэрыторыі Верхняга замка Полацка**

Падчас даследавання ў пахаваннях зафіксаваны адзінкавыя знаходкі (малюнак 3). Сярод выяўленых артэфактаў неабходна адзначыць фрагменты шкляных бранзалетаў (пахаванні №№ 2, 9, 15, 42, 47, 56, 72), прасліцы (пахаванні №№ 15, 22, 35, 69, 96), ілжэвіты пярсцёнак з каляровага металу (пахаванне № 1), паясныя кольцы і спражкі (пахаванні №№ 13, 71, 87), шкляныя пацеркі (пахаванне № 84), цвікі (пахаванні №№ 2, 10), рэшткі спарахнелага алавянага галаўнога венчыка (пахаванне № 43), фрагменты амфар (пахаванні №№ 34, 35), а таксама шматлікія фрагменты керамічных гаршчкоў “S”-падобнага профілю, тыповыя для культурнага слою Полацка XII–XIII стст. Асобна неабходна вылучыць знаходкі двух фрагментаў аднабаковых грабянёў (пахаванні №№ 57 і 58; малюнкі 3:1, 3:2) і цалкам захаваны галаўны венчык, складзены са спіралек і колцаў (пахаванне № 71, малюнкі 3:8–3:11).




**1–2 – грабяні; 3–5 – шкляныя бранзалеты; 6–7 – прасліцы; 8–11 – дэталі галаўнога венчыка**

**Малюнак 3. – Асобныя знаходкі з могільніка XI–XIII стст. на тэрыторыі Верхняга замка Полацка**

На ніжнюю дату існавання могільніка ўказваць знаходкі двух фрагментаў аднабаковых грабянёў, асноўны час бытавання якіх прыпадае на X–XI стст., а таксама галаўнога венчыка, датаваць які паводле аналогій магчыма XI–XII стст. [8, с. 49; 9, с. 101; 10, с. 82; 11, с. 114]. Улічваючы, што найбольш старажытныя матэрыялы з перадмацерыковых слаёў і мацерыковых ям у Заходнім раскопе 1 датуюцца часам не ранейшым за канец X – пачатак XI стст., з'яўленне могільніка трэба папярэдне адносіць да XI ст. На верхнюю храналагічную мяжу функцыянавання некропаля ўказваюць знаходкі шкляных бранзалетаў, якія з'яўляюцца ў культурным слоі Полацка ў XII ст., а найбольшае распаўсюджанне атрымліваюць у XIII стст. [12, с. 118]. Шыферныя прасліцы, зробленыя з ружовага, ліловага, а радзей шэрага оўручскага сланцу з'яўляюцца ў Полацкай зямлі ў канцы XI ст. і практычна поўнасцю знікаюць у другой палове XIII ст., што трэба звязваць са спыненнем існавання спецыялізаваных майстэрняў у Оўручы і разбурэннем гандлёвых шляхоў пасля 1240 г. [13, с. 17]. Перыядам XII–XIII стст. датуюцца таксама ілжэвітыя пярсцёнкі [14, с. 20]. У сувязі з вышэйадзначаным, верхняй храналагічнай мяжой існавання полацкага некропаля на Верхнім замке трэба лічыць XIII ст. Такім чынам, наяўныя матэрыялы дазваляюць датаваць могілкі ў межах XI–XIII стст.

Неабходна таксама адзначыць, што некропаль мог адносіцца да невядома храма ці капліцы. Аб наяўнасці ў непасрэднай блізкасці ад могілак невядомага цаглянага будынку культавага прызначэння ўказваюць плямы разбурэння ў выглядзе блокаў плінфяной кладкі на вапнавай рошчыне. Пры гэтым аналіз плінфы дазволіў устанавіць яе адрозненне ад цэглы з храма на дзяцінцы. Сярод сведчанняў існавання храма магчыма адзначыць знаходкі падлогавых плітак, якія не маюць аналагаў у Полацку, а таксама асобныя фрагменты тынкоўкі з фрэскавым роспісам, расплаўлены свінец і інш. Улічваючы, што цэнтр найбольшай канцэнтрацыі пахаванняў лакалізуецца бліжэй да паўночна-заходняга вугла харчаблока, магчыма меркаваць аб размяшчэнні невядомага храма менавіта ў дадзенай частцы Верхняга замка.

Антрапалагічная экспертыза матэрыялаў пахаванняў на Верхнім замке Полацка праведзена В.А. Емельянчык. Вызначэнне полу і ўзросту ажыццяўлялася з выкарыстаннем стандартных метадаў. Пол вызначаўся на падставе ацэнкі характэрных для мужчын і жанчын структурных асаблівасцей чэрапа і тазавых костак. Пры вызначэнні біялагічнага ўзросту дарослых індывідаў улічвалася, пераважна, ступень зарастання чарапных швоў у спалучэнні са ступенню сцёртасці зубоў. Узрост дзіцячых касцякоў вызначаўся па ступені развіцця зубной сістэмы па схеме D.H. Ubelaker-а, а таксама на падставе марфалагічнага крытэрыю, які ўлічвае ступень акасцянення розных аддзелаў шкілета і памеры доўгіх трубчастых костак [15, p. 64; 16, s. 143]. Рэканструкцыя прыжыццёвай даўжыні цела памерлых здзяйснялася на падставе даных вымярэння доўгіх костак па метадзе M. Trotter,

G.C. Gleser [16, s. 180–182]. Вымярэнне чэрапаў з наступным вылічэннем вуглоў і паказальнікаў праводзілася ў адпаведнасці са стандартнай методыкай. Для ацэнкі атрыманых паказчыкаў выкарыстоўваліся табліцы краніяметрычных канстант [17, с. 112–127].

У ходзе антрапалагічнай экспертызы астэалагічных матэрыялаў з пахаванняў на тэрыторыі Верхняга замка было выяўлена не менш 160-ці шкілетаў, сярод якіх 87 належалі дарослым індывідам (24 мужчыны, 36 жанчын; пол 27-мі дарослых не быў вызначаны з-за фрагментарнай захаванасці шкілетаў), 73 – дзецям рознага ўзросту (табліца). У даследаванай групе пахаванняў дзіцячыя рэшткі складаюць 45,6% ад агульнай колькасцісці пахаваных, што набліжаецца да чаканых паказчыкаў і сведчыць аб добрай захаванасці шкілетных матэрыялаў. Што да суадносінаў полаў, то на могілках з тэрыторыі Верхняга замка назіраецца даволі нетыповая сітуацыя – жаночыя пахаванні колькасна пераважаюць над мужчынскімі.

Табліца. – Сярэднія памеры і паказальнікі мужчынскіх і жаночых выбарак чэрапаў з могільніка XI–XIII стст. на тэрыторыі Верхняга замка Полацка

| Прыкмета | Мужчыны | | | Жанчыны | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | *N* | *M* | *S* | *N* | *M* | S |
| *Мазгавы аддзел чэрапа, мм* | | | | | | |
| 1. Падоўжаны дыяметр | 11 | 186,7 | 7,14 | 13 | 178,4 | 4,57 |
| 8. Папярочны дыяметр | 11 | 137,6 | 4,39 | 13 | 137,2 | 3,87 |
| 5. Даўжыня асновы чэрапа | 11 | 105,3 | 3,2 | 8 | 97,9 | 3,4 |
| 9. Найменшая шырыня ілба | 11 | 98,9 | 3,78 | 13 | 95,3 | 3,48 |
| 10. Найбольшая шырыня ілба | 11 | 118,5 | 5,2 | 13 | 117,2 | 3,83 |
| 12. Шырыня патыліцы | 11 | 109,0 | 5,25 | 11 | 106 | 2,28 |
| 17. Высотны дыяметр | 11 | 136,7 | 5,22 | 8 | 130,9 | 4,76 |
| *Тваравы аддзел чэрапа, мм* | | | | | | |
| 45. Скулавы дыяметр | 9 | 134,8 | 4,63 | 10 | 124,8 | 5,39 |
| 43. Верхняя шырыня твару | 11 | 106,1 | 3,39 | 13 | 102,5 | 3,53 |
| 46. Сярэдняя шырыня твару | 9 | 95,7 | 3,99 | 9 | 90,6 | 6,75 |
| 40. Даўжыня асновы твару | 9 | 103,3 | 5,19 | 7 | 93,6 | 6,94 |
| 48. Верхняя вышыня твару | 9 | 69,9 | 2,65 | 9 | 67,4 | 3,28 |
| 51. Шырыня арбіты | 10 | 42,4 | 2,31 | 9 | 41,3 | 1,15 |
| 52. Вышыня арбіты | 10 | 31 | 1,63 | 9 | 32,9 | 2,67 |
| 54. Шырыня носу | 9 | 26,3 | 1,3 | 9 | 24,9 | 1,83 |
| 55. Вышыня носу | 9 | 50,3 | 1,73 | 9 | 48,9 | 4,04 |
| DC. Дакрыяльная шырыня | 9 | 23,1 | 1,27 | 9 | 21,2 | 2,18 |
| DS. Дакрыяльная вышыня | 9 | 12,9 | 1,93 | 9 | 10,6 | 1,36 |
| SC. Сіматычная шырыня | 9 | 8,9 | 1,51 | 9 | 9,6 | 2,45 |
| SS. Сіматычная вышыня | 9 | 4,3 | 0,75 | 9 | 3,7 | 0,87 |
| *Індэксы, адз.* | | | | | | |
| 8:1. Чарапны паказальнік | 11 | 73,8 | 4,34 | 13 | 76,9 | 2,92 |
| 40:5. Паказальнік выступання твару | 9 | 98,1 | 3,75 | 7 | 95,4 | 6,26 |
| 48:45. Верхнетваравы паказальнік | 8 | 51,6 | 2,01 | 8 | 52,9 | 2,58 |
| 52:51. Арбітный паказальнік | 10 | 73,3 | 4,77 | 9 | 79,7 | 6,93 |
| 54:55. Насавы паказальнік | 9 | 52,3 | 3,9 | 9 | 51,3 | 6,64 |
| DS:DC. Дакрыяльны паказальнік | 9 | 56 | 7,07 | 9 | 50,2 | 7,69 |
| SS:SC. Сіматычны паказальнік | 9 | 48,6 | 8,71 | 9 | 39,9 | 13,27 |
| *Вуглы гарызантальнай прафіліроўкі, град.* | | | | | | |
| M77. Назамалярны вугал | 10 | 139,6 | 5,08 | 10 | 141,8 | 4,52 |
| zm. Зігамаксілярны вугал | 9 | 125,6 | 2,84 | 9 | 128,3 | 2,08 |

Вынікі вызначэння полу і ўзросту пахаваных былі выкарыстаны для правядзення палеадэмаграфічнага аналізу. Сярэдні ўзрост смерці дарослых (без уліку дзіцячай смяротнасці) у даследаванай групе насельніцтва Полацка XI–XIII стст. склаў 36,5 год, што адпавядае паказчыкам, зарэгістраваным для сярэднявечнага насельніцтва Старажытнай Русі. Так, паводле дадзеных В.П. Аляксеева, у славянскіх курганных серыях XI–XIII стст. (крывічы, славене, вяцічы, радзімічы, дрыгавічы, севяране, паляне) сярэдняя працягласць жыцця вагалася ў межах 32,3–38,3 гадоў [18, с. 16]. Пікі смяротнасці ў даследаванай групе насельніцтва прыходзіліся на ранні дзіцячы ўзрост (да 6-ці гадоў), а таксама малады ўзрост (20–30 год), пераважна, за кошт павышанай смяротнасці маладых жанчын, што з'яўляецца тыповай карцінай для многіх чалавечых папуляцый даіндустрыяльнай эпохі.

Згодна з папярэднімі вынікамі вызначэння сярэдняй даўжыні цела, мужчыны-палачане XI–XIII стст. мелі сярэдні рост каля 172 см, жанчыны – каля 159 см. Сярэднявечныя мужчыны-палачане былі ў сярэднім на 6 см вышэй за полацкіх мужчын XVII–XVIII стст., жанчыны – на 4 см вышэй за палачанак XVII–XVIII стст. [19, с. 152]. У параўнанні з сучасным насельніцтвам Беларусі сярэднявечныя палачане, як мужчыны, так і жанчыны, былі ніжэйшымі ў сярэднім на 6 см.

Стан захаванасці краніялагічнага матэрыялу дазволіў здзейсніць вымярэнні 11-ці мужчынскіх і 13-ці жаночых чэрапаў (гл. табліцу). Усярэднены мужчынскі краніятып характарызуецца даліхакраніяй (чарапны паказальнік 73,8), вялікім падоўжным і малым папярочным дыяметрамі чэрапа, вялікім высотным дыяметрам. Твар сярэдні, як па абсалютных памерах, так і па верхнетвараваму паказальніку, артагнатны. Арбіты сярэднія па шырыні, нізкія, як па абсалютнай велічыні, так і па арбітным паказальніку (хамеконхія), нос сярэдні, як па абсалютных памерах, так і па насавым паказальніку, з моцна выступаючым пераноссем, аб чым сведчаць высокія значэнні дакрыяльнага і сіматычнага паказальнікаў. Твар моцна прафіляваны ў гарызантальнай плоскасці з невялікім сплашчэннем у верхняй частцы (назамалярны вугал 139,7°).

Жаночая выбарка чэрапаў па сваіх усярэдненых характарыстыках мезакранна (чарапны паказальнік 76,9), з вялікім падоўжным і сярэднім папярочным дыяметрамі, вялікім высотным дыяметрам. Як і ў мужчын, тваравы аддзел характарызуецца артагнатнасцю, сярэднімі катэгорыямі абсалютных памераў і верхнетваравага паказальніка. Арбіты, як і ў мужчынскай выбарцы, сярэднія па шырыні і нізкія па вышыні, аднак па арбітным паказальніку – сярэднія. Сплошчанасць твару на ўзроўні арбіт і скул у жаночай выбарцы выражана трохі больш, чым у мужчынскай (назамалярны вугал – 141,8°, зігамаксілярны вугал – 128,3°).

У цэлым па сваіх антрапалагічных асаблівасцях як мужчыны, так і жанчыны з пахаванняў на тэрыторыі Верхняга замка ў Полацку, выяўляюць значнае падабенства з сельскім насельніцтвам Полацкай зямлі, прадстаўленым матэрыяламі курганных пахаванняў XI–XIII стст.

**Заключэнне.** Такім чынам, падчас выратавальных археалагічных прац на тэрыторыі Верхняга замка Полацка выяўлены гарадскі некропаль, які магчыма датаваць XI–XIII стст. Падчас даследаванняў знойдзены шкілетныя рэшткі не менш 160 індывідаў, сярод якіх 87 належалі дарослым, а 73 – дзецям рознага ўзросту. Пахаванні зроблены ў драўляных трунах, якія былі выкананы з дошак, часта абкладзеныя бяростай. Арыентацыя большасці пахаваных заходняя, з адхіленнямі на поўнач і поўдзень. Датаванне могільніка праведзена на падставе пахавальнага інвентару, сярод якога сустрэты аднабаковыя грабяні, шкляныя бранзалеты, шыферныя праслíцы і іншыя датуючыя артэфакты. Наяўныя даныя дазваляюць меркаваць аб прыналежнасці могілак да невядомага сёння цаглянага будынку культавага прызначэння, на што ўказваюць выяўленыя на ўчастку побач з пахаваннямі плямы разбурэння ў выглядзе блокаў плінфяной кладкі на вапнавай рошчыне, а таксама асобныя фрагменты тынкоўкі з фрэскавым роспісам, расплаўлены свінец і інш.

## ЛІТАРАТУРА


1. Дук Д.У. Полацкія могілкі 12–18 ст. // Археалогія Беларусі: энцыкл. У 2 т. – Мінск: БелЭн, 2009–2011. – Т. 1: А – К. – 2009. – С. 214–215.
2. Дук Д.У., Емяльянчык В.А., Коц А.Л. Могілкі на стрэлцы Ніжняга замка ў Полацку // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск, 2018. – Вып. 29. – С. 171–182.
3. Дук Д.У., Коц А.Л. Старажытны Полацк: новыя даныя па выніках раскопак на тэрыторыі Ніжняга замка ў 2014 годзе // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск, 2016. – Вып. 27. – С. 31–41.
4. Чараўко В.У. Пахавальныя помнікі Полацка XIV–XVIII стст. // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А. Гуманит. науки. – 2019. –№ 1. – С. 129–135.
5. Дук Д.У. Археалагічныя раскопкі на старажытным полацкім гарадзішчы ў 2007 г. // Матэрыялы па археалогіі Беларусі: нав. зб. / гал. рэд. В.М. Ляўко; Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Минск: Ін-т гісторыі НАН Беларусі, 2009. – Вып. 17: Археалагічныя даследаванні на Беларусі ў 2007 годзе. – С. 186–189.
6. Дук Д., Плавінскі М. Аб полацкім некропалі X–XIII стст. // Гіст.-археал. зб. / рэдкал. В. Вяргей і інш. – Мінск: Ін-т гісторыі НАН Беларусі, 2003. – № 22. – С. 173–186.
7. Начальный этап новых исследований Верхнего замка Полоцка (2018–2020 гг.) / О.Н. Левко, И.В. Магалинский, П.М. Кенько, А.Л. Коц, В.В. Черевко, А.А. Соловьев, Л.Г. Калбеко // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў: зб. арт. V міжнар. навук. канф., Полацк, 15–16 крас. 2021 г. / Полац. дзярж. ун-т; пад агульн. рэд. А.І. Корсак (адк. рэд.), В.У. Чараўко, У.Я. Аўсейчыка. – Наваполацк: Полац. дзярж. ун-т, 2021. – С. 48–60.
8. Мядзведзева В.У. Касцярэзная вытворчасць Полацкай зямлі IX–XIII стст. – Мінск: Беларус. навука, 2013. – 236 с.
9. Давидан О.И. Гребни Старой Ладоги // Археол. сб. Государственного Эрмитажа. – Л., 1962. – Вып. 4. – С. 95–108.
10. Древнерусский некрополь Пскова X – начала XI века. В 2 т. – Т. 1: Раннегородской некрополь древнего Пскова (по материалам раскопов на территории Среднего города). – СПб.: Нестор-История, 2012. – 300 с.
11. Археология севернорусской деревни X–XIII веков: средневековые поселения и могильники на Кубенском озере: в 3 т. / отв. ред. Н.А. Макаров; Ин-т археологии РАН. – М.: Наука, 2007. – Т. 2: Материальная культура и хронология. – 2008. – 365 с.
12. Щапова Ю.Л. Стекло Киевской Руси. – М.: Изд-во МГУ, 1972. – 210 с.
13. Костюкевич А.В. Привозные изделия IX-XIII вв. на территории Полоцкой земли: автореферат ... канд. ист. наук. Минск: Институт истории НАН Беларуси, 2017. – 26 с.
14. Магалінскі І.У. Ювелірныя упрыгажэнні старажытнага Полацка // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуманит. науки. – 2012. – № 9. – С. 16–27.
15. Ubelaker D.H. Human skeletal remains. Excavation, analysis, interpretation. – Washington: Taraxacum, 1989. – 172 p.
16. Piontek J. Biologia populacji pradziejowych. Zarys metodyczny. – Poznań: UAM, 1996. – 217 s.
17. Алексеев В.П., Дебец Г.Ф. Краниометрия. Методика антропологических исследований. – М.: Наука, 1964. – 127 с.
18. Алексеев В.П. Палеодемография СССР // Советская археология. – 1972. – № 1. – С. 3–21.
19. Боруцкая С.Б., Васильев С.В. О стеологические исследование населения города Полоцка XVII–XVIII вв. // Палеоантропология Беларуси / И.И. Саливон и др.; науч. ред. И.И. Саливон, С.В. Васильев; Нац. Акад. Наук Беларуси, Ин-т истории. – Минск: Беларус. навука, 2015. – С. 145–153.


*Паступіў 21.04.2023*

# ПРЕДВАРИТЕЛЬНЫЕ РЕЗУЛЬТАТЫ ИССЛЕДОВАНИЯ МОГИЛЬНИКА XI–XIII вв. НА ТЕРРИТОРИИ ВЕРХНЕГО ЗАМКА ПОЛОЦКА

***И.В. МАГАЛИНСКИЙ, О.А. ЕМЕЛЬЯНЧИК, А.Л. КОЦ***
***(Полоцкий государственный университет имени Евфросинии Полоцкой)***

***П.М. КЕНЬКО***
***(Институт истории Национальной академии наук Беларуси, Минск)***

*В статье представлены предварительные результаты исследования некрополя XI–XIII вв., обнаруженного в ходе спасательных археологических работ на территории Верхнего замка Полоцка. В результате изучения остеологического материала выявлены скелетные останки не менее 160 индивидов, среди которых 87 принадлежали взрослым, а 73 - детям разного возраста. Авторами установлено, что погребения были совершены в деревянных гробах и имели преимущественно западную ориентацию с отклонениями на север и юг. Датировка могильника проведена на основании погребального инвентаря, среди которого встречены односторонние гребни, стеклянные браслеты, шиферные пряслица и другие датирующие предметы. На основании отдельных находок авторы также высказывают предположение о принадлежности могильника к неизвестному сегодня зданию культового назначения из плинфы.*

***Ключевые слова:*** *археология Беларуси, погребальные памятники, материальная культура, топография Полоцка.*

# PRELIMINARY RESULTS OF THE STUDY OF THE CEMETERY OF THE XI–XIII CENTURIES ON THE TERRITORY OF THE UPPER CASTLE OF POLOTSK

***I. MAHALINSKI, V. YEMIALYANCHYK, A. KOTS***
***(Euphrosyne Polotskaya State University of Polotsk)***

***P. KENKO***
***(The Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk)***

*The article presents preliminary results of the study of the cemetery of the 11th-13th centuries, discovered during rescue archaeological work on the territory of the Upper Castle of Polotsk. As a result of the study of osteological material, the skeletal remains of at least 160 individuals were identified, among which 87 belonged to adults, and 73 belonged to children of different ages. The authors found that the burials were made in wooden coffins and had a predominantly western orientation with deviations to the nord and south. The dating of the burial ground was carried out on the basis of grave goods, among which one-sided combs, glass bracelets, slate whorls and other dating items were found. On the basis of individual finds, the authors suggest that the burial ground belongs to a today unknown building made of brick for cult purposes.*

***Keywords:*** *archeology of Belarus, funerary monuments, material culture, topography of Polotsk.*